## У фармаце дыялогу

# Умець не толькі лятаць, але і думаць

### Ігар Сергеенка правёў сустрэчу з курсантамі і выкладчыкамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі

**У сваім выступленні кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА асноўны акцэнт зрабіў на тэзісах, якія прагучалі ў Пасланні Прэзідэнта народу і парламенту. Галоўны з іх — захаванне незалежнасці і гатоўнасць дзяржавы, грамадства яе абараняць.**



Фота БелТА.

Паводле слоў Ігара Сергеенкі, абстаноўка па перыметры граніц Беларусі застаецца складанай. Працягваецца мілітарызацыя рэгіёна, захоўваюцца спробы ўнесці раскол у беларускае грамадства. «Мы бачым, што фашызм канчаткова не пераможаны», — адзначыў Ігар Сергеенка.

Ён прывёў такія лічбы: за вызваленне Польшчы ў вайну загінула больш за 600 тысяч савецкіх салдат, яшчэ 400 тысяч — за вызваленне Прыбалтыкі. «Мільён загінулых там, дзе дзясяткамі, сотнямі зносяцца помнікі!» — звярнуў увагу Ігар Сергеенка.

Супрацьстаяць гэтаму, на думку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, Беларусь можа, захоўваючы памяць аб тых падзеях, народнае адзінства.

Таксама Ігар Сергеенка праінфармаваў прысутных аб частых правакацыях з боку суседніх дзяржаў, аб дамоўленасці з Расіяй аб размяшчэнні ў Беларусі тактычнай ядзернай зброі, аб мерах супрацьдзеяння санкцыям, фэйкам.

«Захад нарошчвае намаганні па фарміраванні аднапалярнага свету, актыўна душачы іншадумства і заахвочваючы русафобскія погляды, — адзначыў Ігар Сергеенка. — Захад не адмовіўся ад спроб дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне рознымі спосабамі, у тым ліку шляхам закідвання розных дыверсійных, тэрарыстычных груп».

У такім няпростым становішчы ў нашай краіне распрацоўваецца абноўленая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі. «Гэтая ідэя з'явілася не раптоўна. З'явіліся новыя рызыкі, выклікі, пагрозы сусветнага маштабу. Неабходна было ўносіць карэктывы з часу выдання той канцэпцыі, па якой мы цяпер працуем і жывём», — растлумачыў Ігар Сергеенка.

Паводле яго слоў, Канцэпцыя — дастаткова складаны дакумент. Наперадзе вялікая работа, каб на працягу года арганізаваць яе шырокае абмеркаванне. «Упэўнены, што налета, калі пачне працаваць Усебеларускі народны сход, дадзенае пытанне будзе вынесена адным з першых, каб зацвердзіць Канцэпцыю», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка таксама адказаў на пытанні курсантаў акадэміі. У прыватнасці, была закранута тэма патрыятызму. Па словах Ігара Сергеенкі, з улікам апошніх падзей яна знайшла адлюстраванне і ў новай рэдакцыі Канстытуцыі. «Як я разумею — гэта любоў да Радзімы: сваёй краіны, малой радзімы, сям'і, і бескарыслівае служэнне. Выхоўваць трэба з маленькага ўзросту на асабістым прыкладзе: сваімі ўчынкамі, паводзінамі, адносінамі да старэйшых, да памятных мясцін, святыняў», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Яшчэ адзін важны напрамак у патрыятычным выхаванні — захаванне гістарычнай памяці, але тут галоўнае — не колькасць мерапрыемстваў, а іх эфектыўнасць. «На пытанне, як выхаваць патрыёта, я адказаў бы так: і словам, і справай», — сказаў Ігар Сергеенка.

Таксама юнакоў цікавілі маладзёжная палітыка, якая праводзіцца ў дзяржаве, замацаванне маладых спецыялістаў на рабочых месцах, развіццё рэгіёнаў.

Курсанты ініцыіравалі заснаванне асаблівай даты — Дня памяці героў Беларусі. Ігар Сергеенка падзякаваў моладзі за ініцыятыву і паабяцаў вывучыць прапанову.

**Паводле БелТА.**